№ 2 (39) Вільня, лістапад 1924 г. Цана асобнага нумару 10 грошау.

РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Нхай жыве злучаная Беларуская Сацыалістычная Савецкая Рэспубліка!

НАРОДНАЯ ПОМСТА.

Нягодныя акупанты дачакаліся. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна загаварыла. Даведзенае да роспачы беларускае і украінскае сялянства, у адказ на гвалты і зьдзекі над народнымі масамі, у адказ на грабежніцкія падаткі, на нацыянальны уціск і садызм паліцыі, пачынае хватацца за зброю. Страціушы цярплівасьць, ахоплены справядлівым гневам, беларускі і украінскі сялянін пачынае ня толькі паліць асадніцкія і абшарніцкія маёнткі, забіваць ненавістных ворагау, але пачынае стыхійнае паустаньне і не баіцца нападаць на павятовыя месты, на цягнікі і нават на узбраеных з ног да галавы вышэйшых прадстаунікау акупацыі — вяльможных ваяводау. Стоупцы, Лунінец і Барановічы пакуль што найбольш яскравыя факты рашучасьці і сьмеласьці народнае помсты.

Але нягодная акупацыя можа давясьці народныя масы і да больш жорсткіх выступленьняу, да пагалоунае разьні усіх абшарнікау і асаднікау і усіх ненавістных народу прадстаунікау польскае панскае улады. У новых абставінах у больш шырокіх разьмерах можа паутарыцца добра вядомая польскай шляхце галіцыйская разьня, якая віхрам несупынным, крывавай блыскавіцаю пранясецца па замучанай Беларусі і Украіне.

І вось каб пазбавіцца гэтых ракавых для сябе скуткау справядлівага народнага гневу і помсты — польскі буржуазны урад хоча справакаваць паустаньне народных масау цяпер, сягодня, хоча крывёю лепшых сыноу паняволянай Беларусі заліць „крэсы", хоча вызваць паустаньне без часу і задушыць яго.

Замест пабітага асьмеянага пад Лунінцом цывільнага ваяводы Даунаровіча — польскі урад адразу назначае на „крэсы" генералау.

Замест трусьлівае паліцыі, якая здольна гвалтаваць толькі безаружных і у паніцы разьбегаецца перад нялічнымі партызанскімі атрадамі—прысылаецца на „крэсы" адборнае войско.

Замест цывільных судоу — суды палявыя і расстрэлы непавінных сялянау.

Вынятковы, ваенны стан ужо фактычна уведзены на Беларусі і Украіне!

Ужо усё зроблена і падрыхтована да таго, каб з кравaжаднаю, варьятскаю злосьцю перабіць нялічныя адважныя паустанцкія атрады і каб адначасна з гэтым пусьціць кроу безабаронным сялянам Заходней Беларусі і Украіны.

Дэлегацыі асаднікоу з „крэсау" на чале з ротмістрам Пухальскім ужо вымагаюць ад ураду афіцыальнага вынятковага стану, — а калі ён на гэта „ня згодзіцца", „пагражаюць" распачаць грамадзянскую вайну, выслаушы у Польшчу сваіх бацькоу, жонак і дзяцей.

Гэта ужо адкрыты вызау. Гэта ужо нічым ня прыкрытая правакацыя, якую пачынаюць асаднікі, а польскі урад само сабою дае згоду на увядзеньне вайсковага стану у „некаторых" паветах.

Мы добра ведаемо—што значыць гэтае у „некаторых" паветах.

Таварышы рабочыя і сяляне! Не паддавайцеся панскай і асадніцкай правакацыі! Сучасны момант не тякі яшчэ, каб можна было даць рашучы бой акупантам.

Наша партыя, якая увабрала і арганізуе у сваіх радах усе найбольш вытрыманыя і баявыя, усе найбольш свядомыя элемэнты рэвалюцыйнага сялянства Беларусі, яшчэ у ліпні месяцы гэтага году прадбачыла крывавыя пляны польскага ураду і шляхты. Яна уже тагды заклікала усё сялянства да рэвалюцыйнае дысьцipліны і вытрыманасьці, да арганізаванае штодзеннае барацьбы з акупантамі. Але разгелдзяушы пытаньне аб паустаньні,—наша партыя прыйшла да переконаньня, што паустаньне сягодня, паустаньне зараз жа было б гібельным для справы рэвалюцыі, бо у гэтым паустаньні мы загубілі б усе найбольш рэвалюцыйныя элемэнты вёскі і не дабіліся б пабеды. Не дабіліся б пабеды дзеля таго, што пры сучасным становішчы у Польшчы няма пэунасьці у тым, што нас рашуча падтрымаюць польскія рабочыя і сяляне.

І дзеля гэтага наша партыя лічыць, што чарговаю задачаю усіх рэвалюцыйных рабочых і сялянау нашага краю зьяуляецца подрыхтоука і арганізацыя сваіх сілау да рашучай барацьбы.

Тых, хто хапаецца ужо сягодня за аружжа, хто ахоплены справядлівым гневам і помстаю, усіх сьмелых і адважных мы клічам у свае рады. Гуртуйцеся навакол чырвоных сьцягау нашае партыі, не паддавайцеся на правакацыю паноу.

Тады, калі будзем моцнымі, тады, калі прыдзе час паустаньня, — мы паклічам вас у бой і з дапамогаю рэвалюцыйных рабочых Украіны, Польшчы і рабочых і сялянау Саюзу Савецкіх Рэспублік прагонім на векі вечныя акупантау з нашае зямлі.

А цяпер—да вытрыманасьці, да арганізованнасьці, да цьвёрдасьці і рэвалюцыйнае дысьцыпліны!

Аб партыйнай працы у польскай арміі.

5-ый Кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыаналу у сваёй рэзалюцыі па палітычнаму дакладу тов. Зіноуева падкрэсьлівае, што Камуністычныя партыі ніколі не павінны забывацца, што адзіным сродкам, які забязьпечвае пабеду рабочых, зьяуляецца аружнае паустаньне з мэтаю захапіць уладу у свае рукі.

У гэтым напрамку павінна ісьці наша партыйная праца. Калі мы практычна пачынаемо прыступаць да вырашэньня гэтае задачы, то мы павінны добра памятаць, што у руках нашых ворагау ёсьць магутны сродак іх панаваньня—гэта армія, якую буржуазея можа выкарыстаць.

У час паустаньня гэтая армія адыгрывае рашаючую ролю.

Расейская рэвалюцыя перамагла таму, што армія стала на бок паустаушых.

Значыцца задачаю кожнае партыі, якая ідзе да паустаньня, з'яуляецца прыцягнуць армію на свой бок з тым, каб яна выступіла процiу буржуазнага правіцельства, або у горшым выпадку, каб гэтая армія спачувала паустаушым і не выступала процiу рабочых і сялянау, адмовілася душыць паустаньне і перадала зброю рэвалюцыанерам.

Гэтая работа сярод арміі вельмі трудная, але партыя павінна яе вясьці яшчэ задоуга да збройнага выступленьня.

Тыя варункі, у якіх прыходзіцца працаваць нашай партыі у Заходней Беларусі, натта востра ставяць перад намі пытаньне аб працы сярод вайсковых.

На „кресах" знаходзіцца больш аднае трэці усяе польскае арміі.

Гэта глауная апора буржуазнага ураду.

З прычыны насьпеваючага паустанскага руху сярод сялянства—нам трэба цяпер ва што бы то ні стало зьвярнуць сваю увагу на армію, каб абхапіць яе сваімі уплывамі.

Ёсьць два шляхі для гэтага:

Першы шлях—гэта шлях агітацыі, тлумаченьня нашых задач сярод вайсковых рабочых і сялянау. Іх трэба уцягнуць у арбіту палітычнага жыцьця і уплывау партыі. Гэтая агітацыя павінна прыспасобіцца к умовам быту арміі, унутраннае жыцьцё якое напамінае сабою горшыя часы арміі Мікалая II.

Другі шлях—гэта стварэньне ваеннае арганізацыі партыі, якая у рашучы момант паустаньня павінна стаць тым ядром, навакол каторага будуць гуртавацца паустаушыя вайсковыя часьці.

Гэтая работа павінна распачацца з арганізацыі вайсковых ячэяк у кожнай часьці.

Удачная камбінацыя гэтых двух мэтадау работы дасьць нам магчымасьць вырашыць трудную задачу — падрыхтоукі арміі для барацьбы за уладу рабочых і сялян.

ЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА РАБОЧЫХ—ЗМАГАНЬНЕ ЗА АДЗІНСТВА ПРАФЭСЫАНАЛЬНАГА РУХУ РАБОЧЫХ.

Ніколі адзінства усіх сілау рабочых ня было так патрэбна, як цяпер.

Таварышы! Разаблачайце здраду правадыроу пэпэсауцау, бундауцау, хадэкау.

Нацыяналізм у руху рабочым—гэта атрута.

Там, дзе ёсьць гэты нацыяналізм, там няма здаровага клясовага змаганьня, там сіла рабочых губіцца.

Нацыянальныя саюзы патрэбны толькі буржуазеі. Ей лягчэй тады эксплёатаваць рабочых.

Таварышы! Змагайцеся за адзінства прафесыанальнага руху! Старайцеся растлумачыць усім рабочым, якія уваходзяць у польскія і жыдоускія саюзы, што іх ашукваюць здраднікі.

Звычайны радавы рабочы, у якім бы ён ня быу саюзе, — ваш таварыш. Ён толькі часова ня з намі. Тады, калі ён зразумее нас, — ён пакіне і хадэкау, і бундауцау, і пэпэсауцау і прыдзе да нас. Нашаю задачаю зьяуляецца пераняць усіх рабочых, арганізаваць іх у адзіныя клясовыя рабочыя саюзы.

ПАМЯТАЙЦЕ!

У турмах панскай Польшчы гніюць тысячы барацьбітоу за справу рэвалюцыі. Тая партыйная і прафэсыянальная арганізацыя лепшая, якая больш дапамагае сваім арыштаваным таварышам.

Кожны партыйны камітэт, кожная ячэйка, кожны прафсаюз павінен выбраць з свайго складу даверанага чалавека, які б клапаціуся аб арыштаваных, зьбірау для іх ахвяры грашыма, прадуктамі, бялізнай, адзежай.

Работнікі і сяляне! Чытайце і пашырайце сваю газэту „ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ".

Паведамляйце рэдакцыю аб усіх гвалтах акупантау.

БАРАЦЬБА ЗА ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК НА БЕЛАРУСІ.

(глядзі № 1).

6. Савецкая Беларусь і Савецкая Літва.

Адначасна з утварэньнем Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, — паустала Савецкая Літва.

У ноч з 5-га на 6-е студзеня 1919 году у Вільню увайшлі першыя аддзелы Чырвонае Арміі. Пачалася арганізацыйная, творчая праца рэвалюцыі.

Але націск белае Польшчы, якая на сваім штандары напісала імперыялістычны лёзунг „ад мора і да мора", прымусіу і Савецкую Беларусь і Савецкую Літву моцна задумацца над сваім становішчам.

Трэба абараняцца ад супольнага ворага — белае польскае шляхты, якая сілаю імкнецца здабыць назад свае маёнткі.

Паустае саюз Савецкае Літвы і Беларусі. 27 лютага у Вільні на урачыстым пасяджэньні Выканаучых Камітэтау Літвы і Беларусі абвяшчаецца Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі...

Першы аб'еднаны З'езд Камуністычных партыяу Літвы і Беларусі адбыуся у Вільні 3—6 сакавіка 1919 году. Была утворана адна Камуністычная партыя Літвы і Беларусі і выбраны адзін Ц.К. з 15 чалавек.

Але польскі імпэрыялізм ня спіць. З дапамогаю Антанты Польшча выступае процiу Вялікага Кастрычніка у нашым краі. Расея, абкружаная у гэты час са усіх бакоу, ня можа даць дапамогі, і Чырвоная Армія пад націскам сьвежых сілау контррэвалюцыі пачынае адыходзіць крок за крокам. Зноу пачынаюцца цяжкія часы акупацыі. На гэты раз замест немцау—прышоу пан Пілсудскі.

7. Першая Польская акупацыя і новыя авантуры „незалежнікау". (8 VIII 1919 г.—11 VII 1920 г.).

Сталіца Беларусі, Менск, ужо 8 жніуня знаходзіцца у руках польскіх генералау. Польская армія даходзіць аж да Беразіны.

Сярод беларускіх сацыялугадоуцау прыход Пілсудскага, быушага пэпэсауца, падымае новыя надзеі.

Пачынаецца новае халуйства перад акупантамі. Гэтае халуйства найбольш яскрава выявілася тады, калі пан Пілсудскі прыехау у Менск, 18 верасьня. 17 верасьня, перад самым прыездам, беларуская „незалежніцкая" газэта „Звон" зьмясьціла хвалебныя артыкулы у чэсьць „дарагога госьця" і вялікімі літэрамі надрукавала:

„Прывет табе, Начальніку польскае дзяржавы, на тваёй роднай зямельцы Беларусі", а прадстаунік беларускага нацыянальнага камітэту на урачыстым спатканьні Пілсудскага у будынку „Дваранскага Сабраньня" закончыу сваю прамову так:

„Гатовы мы сказаць табе на Меншчыне ня толькі нашае сягодняшняе „дзякуй", але і заусёды „здароу будзь, прыходзь да нас, наш госьцю мілы, суседзю дарагі"...

Далей ісьці некуды.

Даваць камэнтарыі да такіх прывітаньняу няма сэнсу.

8. А у гэты час на вёсцы...

Абшарнікі і шляхцюкі спаткалі польскіх ахвіцэрау і генералау так сама з захапленьнем. Але зусім другі настрой быу у колах мястачковае і вясковае бедноты. Адразу пачаліся пагромы. Шукалі камуністых, жыдоу, сялян, якія спачувалі Саветам. Даволі было якому небудзь шляхцюку паказаць пальцам на чалавека, што гэта бальшавік, як гэты чалавек ставіуся да сьценкі.

Вярнуліся фабрыканты і паны. І тыя і другія пачалі шукаць і забіраць сваю маемасьць і зямлю, адабраную у іх бальшавікамі. Вастрогі запоуніліся мястачковаю і вясковаю беднатою. Загулялі шомпал і бізун. Толькі і чулася на Беларусі „двадзіесьціа пьенць"...

Усюды насаджауся зьвярыны каталіцка-польскі шавінізм. Адкульсь зьявілася цэлая хмара ксяндзоу. Пайшла гвалтоуная паланізацыя і клерыкалізацыя школы. Беларусь застагнала ад уціску і гвалтау.

У адказ на уціскі і белы тэрор шляхты пачынаецца на Беларусі падземны рух. У гарадох і мястэчках жыдоускія рабочыя пакідаюць „бунд" і „паолейцыон" і ідуць пад штандары Камуністычнае партыі Літвы і Беларусі, якая працуе падпольна. Адначасна з гэтым на вёсцы вырастае Беларуская Камуністычная арганізацыя, якая кіруецца з Менску. На чале гэтае арганізацыі становяцца тов. Булат, Ігнатоускі і др. беларускія інтэлігэнты, вышедшыя з вёскі.

Вырастае паустанцкі рух, які з асабліваю сілаю выбухае у 1920 годзе вясною... Растрэлы, бізун, шомпал, турма.—не памагаюць панам, але наадварот пашыраюць паустанцкі рух. Адначасна з гэтым пачынаецца расклад польскае арміі, слабнуць крыльлі белага арла.

Чырвоная армія ізноу нясе Вялікі Кастрычнік на Беларусь. 11 ліпеня 1920 году разам з паустанцамі Чырвонаармейцы займаюць Менск. З быстратою блыскавіцы ідзе вызваленьне Беларусі ад акупантау.

9. Акупацыя Заходней Беларусі.

Праз нейкі час, у кастрычніку 1920 г. белая Польшча, сабраушы свае сілы, з дапамогаю Француазау, прагне яшчэ раз захапіць Беларусь. Але на гэты раз зруйнаваць Савецкую Беларусь яна ня мае сілы.

Затое заходняя частка яе ізноу падпадае пад ярмо акупацыі.

У жывае цела народу убіваюцца гранічныя слупы...

І з таго часу, з канца 1920 году Заходняя Беларусь стогне пад новаю, другою акупацыяй польскае буржуазеі і шляхты.

Але Савецкая Беларусь жыве. Як маяк, яна сьвеціць працоуным Горадзеншчыны, Віленшчыны, Палесься, якія ізноу уздымаюцца на барацьбу з нягоднымі акупантамі.

Пад чырвонымі сьцягамі Вялікага Кастрычніка ідзе гэтая упартая барацьба працоуных грамадау Заходней Беларусі.

Камуністычная партыя зьбірае, гартуе рэвалюцыйныя сілы, каб нанясьці апошні сьмяртэльны удар у самае сэрца акупантау; каб назаусёды вызваліць край і пабудаваць влучаную Беларускую Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку.

СЬВЯТО РЭВАЛЮЦЫІ У ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Беласток. У горадзе мітынгау і дэманстрацыі ня было. У ночы з 6-га на 7-е лістапада былі вывешаны два чырвоных сьцягі з надпісамі: „Няхай жыве Савецкая Польшча", „Няхай жыве Злучаная Савецкая Беларусь". Па вуліцах бегалі пажарнікі і зьнімалі гэтыя сьцягі.

У Сьвіслачы было вывешана 7 сьцягау.

У Вауковыску — 8. Апрача таго на вёсцы былі вывешаны чырвоныя сьцягі на 6 школах.

Берасьцейскі вокруг. У Берасьці над Бугам быу вывешан адзін цэнтральны сьцяг і па гораду шмат маленькіх. Апрача таго адбыуся мітынг, на якім сабралася каля 300 чалавек.

Баранавіцкі вокруг. У Слоніме на трубе разбуранай фабрыкі быу вывешаны чырвоны сьцяг з нашымі лёзунгамі. „Храбрая" паліцыя рашыла, што пад фабрыкай знаходзіцца бальшавіцкая міна і як толькі хто нябудзь залезе на трубу, каб зьняць сьцяг, міна узарвецца.

Адна справа катаваць сялянау, другая рызыкаваць жыцьцём. „Храбрая" паліцыя выставіла стражу і ахраняла наш сьцяг у працягу двух дзён.

За грошы адзін пастароньні чалавек асьмеліуся на другі дзень палезьці на трубу і зьняць сьцяг.

ЛЕНІНСКАЯ МОЛАДЗЬ.

Калыскаю рэвалюцыйнага руху сярод рабочай і сялянскай моладзі СССР былі Ленінград і Масква.

Баявы Ленінскі Камсамол радзіуся у тыя вялікія дні Кастрычніка, калі уся Расея была ахоплена агнём рэвалюцыі...

Але толькі 29 кастрычніка 1918 г. адбыуся першы Усерасейскі Зьезд рабочай і сялянскай моладзі у Маскве... З гэтае даты і пачынаецца слауная гісторыя Камуністычнага Саюзу Моладзі СССР, якая прывяла да стварэньня Камуністычнага Інтэрнацыаналу Моладзі...

Што ж мы маем цяпер праз шэсьць гадоу жыцьця і барацьбы Камсамолу?

Шэсьць гадоу таму назад камсамольцау было толькі 22,000.

Цяпер іх 900,000.

Ахрана працы моладзі, 4-х і 6-ці гадзінны дзень працы, школы на фабрыках і заводах, прафэсыанальная і тэхнічная асьвета моладзі — вось шлях штодзеннае упартае працы Камсамола у СССР, які прывёу масы работнікау і маладых сялянау у Саюз.

Цяпер у СССР вучацца на фабрыках 70,000 маладых рабочых — каб стаць пралетарыямі высокае кваліфікацыі.

Па ініцыатыве Камсамолу адчыняюцца усюды школы сялянскае моладзі—якія будуць рыхтаваць моладзь да працы у полі.

Рух дзяцей — піонерау так сама ініцыатыва моладзі. Гэты рух толькі начынаецца у СССР. Ён мае толькі два гады жыцьця. Але і цяпер піанеры налічываюць 500,000 арганізаваных пралетарскіх і сялянскіх дзяцей.

У Савецкай Беларусі Камуністычны Саюз Моладзі налічвае больш 20,000 сяброу.

Піанерскі рух так сама пашыраецца.

У Заходней Беларусі моладзь прымушана працаваць падпольна. Гэтая праца вельмі цяжкая. Шмат ахвярау вырывае з радоу рэвалюцыйнай моладзі польская буржуазея кожны дзень і кожны час. У турмах Заходней Беларусі палавіна арыштаваных гэта моладзь.

Як найбольш чуткая — моладзь першая устае на рашучую барацьбу з акупантамі. Усюды: у войску, на вёсцы, на фабрыцы моладзь Заходней Беларусі марыць аб вялікай рэвалюцыі Кастрычніка. Яна чакае не дачакаецца паустаньня, каб з галавою рынуцца у бой.

У цяжкіх, непамерна цяжкіх варунках моладзь Заходней Беларусі гартуе свае сілы.

Ні турмы, ні катаваньні, ні растрэлы ня спужаюць нашу моладзь.

І калі Ленінская партыя пакліча Ленінскі камсамол у бой з панскімі акупантамі — наш падпольны камсамолец, наш малады рабочы і сялянін скажа па камсамольску:

Гатоу!

ПЕСЬНЯ ПАУСТАНЦА.

Б'ём мы пана чым папала,
Абы гаду тут ня жыць.
Каб сьлядоу яго ня стала,
Песьняй трэба такжа біць.

Біць у шчэнт чужынца—пана,
Біць прыслужнікау благіх.
А іх логава пагана
Запаліць з бакоу усіх.

То-ж пладзіліся вякамі
Кроу блакітна, бела косьць,
Лезьлі з Польшчы павукамі —
Ня міне іх наша злосьць!

Будзем біцца мы з панамі,
Каб адбіць ахвоту ім
Грунт араці мужыкамі,
Край наш польшчыць, зваць сваім.

Хай ня хопіць нам аружжа,
Хай ня хопіць у песьні слоу —
Ненавісьці маем дужа,
Будзім біць, пальецца кроу!

З резалюцыі V кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыаналу па нацыанальнаму пытаньню.

БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА.

1. Кангрэс лічыць, што справа беларуская побач са справаю украінскаю з'яуляецца найважнейшаю нацыанальна-рэвалюцыйнаю праблемаю у Польшчы, вырашэньне якое магчыма на тых жа самых падставах, як і справы украінскае.

2. Кангрэс падкрэсьлівае слушнасьць ацэнкі II зьездам Камун. Раб. Партыі Польшчы нацыанальнага і зямельнага пытаньня у Заходней Белаусі і энэргічную працу Камуністычнай партыі у Заходней Беларусі у гэтым кірунку, дзякуючы чаму Камуністычная Партыя Заходней Беларусі дасягнула пераважных уплывау на сялянскія масы Заходней Беларусі.

3. Кангрэс падцьверджае высунуты праз КРПП лёзунг злучэньня разарваных частак Беларусі у адну рабоча-сялянскую Беларускую Савецкую Рэспубліку.

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ.

ВІЛЕНСКАЯ АКРУЖНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ К.П.З.Б.

5-га лістапада адбылася Віленская Акружная Канфэрэнцыя Камуністычнай Партыі Заходней Беларусі. Склад яе быу такі: Вільня—3, Вілейскі район—2, Ашмянскі — 2, Сьвенцянскі (беларуско-літоускі) — 2, Валожынскі — 2, Дзісьненскі — 2. Перш чымсь приступіць да парадку дня канференцыя аднагалосна ухваліла вітаць арыштаваных таварышау, Камуніст. Інтэрнацыанал і Камуністычную партыю (б.) Беларусі. Асаблівае прывітаньне канфэрэнцыя паслала Міжнароднаму Сялянскаму Савету.

Парадак дня абняу такія пытаньні:

1) Адчот ЦК і Акружнага камітэту. 2) Адчот з районау і з Вільні. 3) Тактыка Камінтэрну. 4) Тактыка на вёсцы. 5) Культурна-асьветныя справы. 6) Выбары акружнага камітэту і 7) Бягучыя справы.

Па першаму пункту парадка дня канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой адзначаецца, што ЦК зрабіу усё, што мог каб абняць рух вёскі, аднак сувязь ЦК з вёскаю прызнала нездавальняючаю.

Па пытаньню тактыкі Камінтэрна канфэрэнцыя далучылася да пастаноу 5-га кангрэсу і выказала свае задавальненьне работаю польскае камісіі, якая пахерыла апартуністычныя, меншавіцкія нахілы у кіраунічых органах КПП. Адначасна з гэтым канфэрэнцыя зьвернулася да ЦККПП з прывітаньнем і пажаданьнем, каб пастановы другога З'езду партыі аб аддзяленьні Заходней Беларусі ад Польшчы і далучэньні да Савецкай Беларусі больш рашуча былі праведзены у жыцьцё. Па пытаньню тактыкі на вёсцы канфэрэнцыя лічыць яе правільнаю і вымагае больш баявога правядзеньня байкоту падаткау і абароны сялянства ад акупантау.

Па пытаньню культурна-асьветнае працы канфэрэнцыя ухваляе пры районных і акружных камітэтах арганізаваць культурна-асьветныя аддзелы, а пры ЦК партыйную школу.

У бягучых справах канфэрэнцыя застанавілася на сяброускім (членскім) узносе. Прынята пастанова, каб кожны сябар партыі абавязкова плаціу членскі узнос, ад якога асвабаждаюцца толькі безработныя. На конта працы чырвонага крыжу—пастаноулена у хуткім часе распачаць кампанію сярод сялянства на карысьць палітычных арыштаваных, якія у Заходней Беларусі знаходзяцца у непамерна цяжкіх умовах.

Нарешце быу выбраны Акружны камітэт Віленшчыны з 7 таварышау і 2-х кандыдатау.

Віленская Акружная Канфэрэнцыя каранавала сабою доугую падрыхтоучую працу Акружнага Камітэту, які патрапіу залажыць усюды свае арганізацыі і правясьці у кастрычніку і першых чыслах лістападу районныя канфэрэнцыі Віленскую Гарадскую канфэрэнцыю.

ЛІКВІДАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЭСЭРАУ УГОРАДЗЕНШЧЫНЕ.

У жніуні адбылася тайная канфэрэнцыя беларускіх эс-эрау Горадзеншчыны, якая далучылася да пастаноу ліквідацыйнага зьезду 9-га чэрвеня у Менску. Канфэрэнцыя зьвярнулася да усіх эс-эрау Заходней Беларусі з прапазыцыяй зрабіць тое ж самае.

Канфэрэнцыя ухваліла зьліцца з Камуністычнай Партыяй Заходней Беларусі і выбрала ліквідацыйны камітэт.

КАРЭСПАНДЕНЦЫІ.

Рабочае жыцьцё у Вільні.

Масы віленскіх рабочых прыблізна каля першага мая г. г. аканчальна парвалі з здраднікамі ППС. Думалі, што лепей будзе, і зарганізаваліся у саюз „Праца", на чале якога сталі тыя ж самыя пэпэсаускія варацілы Годвуд і ко.

Чакалі, чакалі і нічога не дачакаліся. Годвуд круціу, вярцеу і нарэшце зацягнуу увесь саюз „Праца" да новае „партыі", так званых незалежных сацыялістау. Прыяжджау нават сам Дробнер...

Напэуна рабочыя цяпер зноу чакаюць, шчо пачнецца энэргічная праца у прафсаюзах і г. д. Але дарма... Нічога не дачакаецеся, тазарышы рабочыя, і ад Дробнера, бо гэты камэдыант яшчэ больш закруціць і заблутае вашыя пралетарскія мазгі, а рэвалюцыйная праца і клясавае усьведамленьне будзе стаяць на мейсцы...

Ёсць толькі адзін выхад з таго крытычнага становішча, у якім апынууся рабочы рух у Вільні, дзякуючы здраднікам ППС, халуям з Бунда, хадекам і т. п. Трэба рашуча парваць з перажыткамі шавінізму і сацыялугоды і арганізавацца у адзіныя клясовыя праф. саюзы, а баламутам бундауцам, ППС і навэспечаным незалежнікам Годвудам даць па шапцы.

Беласток.

У Беластоку пэпэсауцы увесь час стараліся захапіць у свае рукі праф. саюзы.

Але рабочыя ні за што не хацелі падтрымліваць іх згодніцкую палітыку.

Усе прауленія клясовых прафсаюзау і Рада профсаюзау вялі рашучую барацьбу з гэтымі здраднікамі.

Тады пэпэсауцы і бундауцы рашылі перавясьці усе прафсаюзы у пэпэсаускі клюб, каб там абрабляць па свойму рабочых.

Рабочыя не пайшлі у гэты клюб і байкатавалі яго.

За гэта пэпэсауская „Централа" у Варшаве распусьціла Раду прафсаюзау і акружную камісію. Аднак і гэта не памагло. Рабочыя не пайшлі у пэпэсаускую крамку. Тады узяуся за работу урад і 9 праф. саюзау па пастанове акружнага суда былі закрыты за „камуністычную дзеяльнасьць". Вось як пэпэсауцы і бундауцы абараняюць інтарэсы рабочых.

В. Галінова. (Вілейск. павету)

У нас будуюцца казармы. Бедныя сяляне аколічных вёсак за жабрацкую плату прымушаны ісьці на падзённую работу, каб пракарміць сваіх дзяцей. Сярод рабочых шмат бежанцау, якія ня маюць ні кала ні двара. Т-ва Буд-крэс з прычыны таго, што гэтыя сяляне не плацяць падаткау у панскую казну, увайшло у згоду з паліцыяй. Заместа таго, каб плаціць заробленыя грошы работнікам, Т-ва аддае гэтыя грошы паліцыі, якая прыходзіць са спіскамі і акладнымі лістамі у Т-ва.

Рабочыя страшна абураны і зьбіраюцца забаставаць.

Горадня.

Усіх прафсаюзау у Горадні—17. Па нацыянальнаму складу дзелюцца на беларусау, жыдоу і палякау. Ёсьць значны працэнт жанчын і падросткау. Па матар'яльнаму палажэньню найгорш чуюцца беларусы дзякуючы сваёй малапісьменнасьці і клясавай несьвядомасьці. Яны у пераважным ліку знаходзяцца у саюзах дворнікау 90 прац., тартачнікоу 75 прац., словам, у тых прафэсыях, якія найменш аплачываюцца. Лепш маюцца ужо жыдоускія рабочыя (тытунёуцы, прыказчыкі, ігла да 100 прац.).

Рабочыя палякі прывелігераваны і служаць на чугунцы, электрычнай станцыі, вадаправодзе і г. п. Усіх арганізаваных рабочых у Горадні налічваецца 2.500 асоб. Найбольш і наймацней арганізаваны і найбольш актыуны жыды і беларусы. Палякі да апошняга часу мала выказалі сваю актыунасьць у прафсаюзнай працы.

Дзякуючы энэргічнай працы старшыні Рады Саюзау Мазуркевічу, прафсаюзныя арганізацыі у Горадні значна узмацаваліся, але з яго арыштам (ужо звольнены) і апошнімі рэпрэсыямі паліцыі некаторыя саюзы зусім бадай распаліся і вядуць самае мізэрнае існаваньне (напр. тытунёуцы). Адзначыць трэба энэргічную дзейнасьць хімічнага саюзу — ён не спалохауся рэпрэсыі і рашуча бароніць свае інтарэсы — вынікам чаго маюць лепшую аплату і добрыя адносіны з працадауцамі. Варта заувважыць, што гэтыя „добрыя" адносіны бываюць тым лепшыя, чым мацнейшы саюз, бо працадауца знае цану арганізаванаму рабочаму і змушаны з ім ладзіць.

Што да тытунёуцау дык развал саюзу стауся з прычыны пераходу фабрык пад дзяржаўную манаполію. Пан дырэктар тытунёвых фабрык выкінуу на вуліцу да 500 кваліфікованых рабочых і не заплаціу належнае па статуту за 6 мес., а набіраець з вуліцы па рэкамэндацыі ксяндза Саванеускага.

Тытунёуцы спачатку зьбянтэжылі, але бяда зноу даказала, што у арганізацыі — моц і іх саюз у апошнія часы зноу стау ажываць. Так сама падпарадковываюцца і другія саюзы. Найбольшая перашкода у працы гэта адсутнасьць памешканьня. Калісь усе саюзы зьмешчаліся у ППС-оускім клюбе, але як саюзы сталі чыста клясовай арганізацыяй, дык ППС спужаліся і усіх павыкідалі з памешканьня і аставілі толькі ППС. Ой страшны калісьць будзе суд над здраднікамі рабочых.

Кажуць. што бяда вуча людзей. І прауда, рабочыя Горадні цяпер праканаліся на заусёды, што ніхто ім не паможа, калі не яны самі, што апека розных ксяндзоу толькі больш поту выціскае, а сабачая ласьлівасьць ППС-ау дурманіць і дэзарганізуе рабочых.

Рабочы пераканауся, што ніхто за яго не уступіцца, не паможа, не паратуе ані паліцыя, ані суд, ані інспэктар працы. З яго „усюды смяюцца, усюды ганяюць" і яму астаецца толькі гарнуцца да сваёй рабочай клясовай арганізацыі, якую ён у сваіх жа інтарэсах павінен падтрымываць і узмацовываць.

Працвакатар АРОН МАЛАДЭЦКІ.

ЦК аб'яуляе А. Маладэцкага з Ваукавыска правакатарам.

ХРОНІКА.

— **Байкот падаткоу.** Знатныя паны, вялікія патрыоты князі і графы Радзівілы, Друцка-Любецкія і іншыя не заплацілі нават і І маёнтковага падатку па Лунінецкаму павету усяго на суму 72,554 зл.—і гэта толькі па аднаму павету!

Дык як рабіць сяляніну, які ня мае з чаго заплаціць, які за дарма абрабляе гэтым панам іхнія абшары, якога кожны паганы чынуша валіць па твары і патурае як скаціну, на якім едзе такая сьвіта, як паліцыянт, ксёндз, пан-абшарнік і генерал-губарнатар?

— **Байкот міністра Міклашэускага.** Да Вільні прыяжджау міністар асьветы і рэлігіі пан Міклашэускі. Усе беларускія культурныя установы байкатавалі міністра.

— **Байкот ваяводы Рачкевіча.** Ваявода Рачкевіч пачау сваю кар'еру у Вільні з аб'езду пагранічча. Люднасьць беларуская байкатавала яго і не прымала ніякога удзелу у разных спатканьнях, урачыстосьцях і г.д. У Маладэчне напрыклад ваяводу спаткалі на вакзале толькі шляхта—і рабін з жыдоускімі купцамі. Ад праваслаўных быу толькі халуй поп. Ад „сялян" толькі войт, які паднёс ваяводзе „хлеб-соль". Пры гэтым пакаузнууся і чуць не зарыу у зямлю носам. Мейсцовыя сяляне кажуць, што гэта дрэнная прымета для пана ваяводы.

— **Ваявода з пажарнаю кішкаю.** У Гарадку, Вілейскага павету, быу пан ваявода Рачкевіч. Некаторыя сяляне думалі:

—Прыехау сам пан ваявода. Трэба паскардзіцца яму на цяжкія падаткі і на тое, што „каталікоу" абкладваюць менш, а „праваслауных" больш.

Напісалі „паданя" і пайшлі да гміны. Але пан ваявода і слухаць нават не захацеу аб падатках. У гэты час, як сабраліся сяляне каля гміны,—падкаціла пажарная каманда, якая хацела паказаць свой спрыт перад „вышэйшаю уладаю". Пачаліся „упражненія". Але аблівалі не будынкі, а.. тых сялян, што прыйшлі з паданямі. Пан староста быу вельмі рад і сьмяяуся, а сяляне прымушаны былі уцякаць ад пажарнае кішкі, хто куды. Большасьць сялянау не хадзіла да ваяводы, бо ведала, што з гэтага нічога ня выйдзе.

— Цяпер для вас будзе навука, казалі яны абмокшым сялянам.

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.